# «Мілая матуля, я цябе люблю!»



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:** **1.** Без бацькі — паўсірата, а без маці і ўся ... *(прык.)*. **5.** «Цеплынёй атуліць // Сонейка зямлю. // Мілая..., // Я цябе люблю!» З верша Л. Пранчака «Мілая ...». **8.** Весялосць лепш за ... *(прык.)*. **9.** Аконны пераплёт. **11.** Руханне на транспарце. **13.** Капельнік, ... . Народныя назвы сакавіка месяца. **14.** Твор антычнай скульптуры. **16.** Рэлігійнае аб'яднанне. **17.** «Пастой, чорна ..., // Ты мая, ты мая! // Яна яму шчабятала: // Не твая, не твая!» З беларускай народнай песні «Купілася чорна галка». **18.** Схіл, спуск. **19.** «Ці я ў мамы не ..., // Ці я не дачушка? // Руса каса да пояса, // Чырвоная стужка». Прыпеўка. **20.** Перамяшчэнне з месца на месца чаго-небудзь. **22.** Прыхільнік скептыцызму. **25.** Тое, што і збан. **27.** Тры рэчы выклікаюць любоў: ..., сціпласць і шчодрасць *(прык.)*. **28.** Высокі сан у хрысціянскай царкве. **29.** Каштоўнае ўпрыгажэнне; найлепшы падарунак жанчыне. **30.** Саманадзейнасць.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ:** **1.** Матчына ... ў дзетках *(прык.)*. **2.** Папугай. **3.** Група падвод. **4.** Беларуская багіня, апякунка кахання, вясновых карагодаў і шлюбаў. **5.** Вершаваны памер. **6.** Вечназялёнае хвойнае дрэва. **7.** Якога куста ..., такога яна і смаку *(прык.)*. **10.** «Біла ж мяне... // Канапляным прутам. // Не хадзі ты, дачушачка, // З гэтым баламутам». Прыпеўка. **12.** «З вясной прыходзіць ..., // І абуджэнне ада сну». З верша А. Грушэцкага «Вясна». **15.** ... да вянца, а розум да канца *(прык.)*. **16.** Без маці і ... не грэе *(прык.)*. **19.** Жаночыя слёзы і ранішні ... высыхаюць аднолькава хутка *(прык.)*. **21.** ... ды добрая жонка — на шчаслівага *(прык.)*. **22.** Гнеў маці як ... — выпадзе многа, але растае хутка *(прык.)*. **23.** У каго на розуме малітва ды ..., а ў яго — бабскі хвост *(прык.)*. **24.** Тое, што і стос. **26.** Закаханым заўсёды ... кароткая *(прык.)*. **27.** Тады Юзік ажэніцца, калі лысы ... аціліцца *(прык.)*.

**Лявон ЦЕЛЕШ,** *г. Дзяржынск.*

**АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** 1. Сірата. 5. Матуля. 8. Багацце. 9. Рама. 11. Язда. 13. Зімабор. 14. Антык. 16. Секта. 17. Галка. 18. Нахіл. 19. Дачка. 20. Адносіны. 22. Скептык. 25. Жбан. 27. Вера. 28. Епіскап. 29. Жэмчуг. 30. Апломб.

**Па вертыкалі:** 1. Сэрца. 2. Ара. 3. Абоз. 4. Лада. 5. Метр. 6. Туя. 7. Ягада. 10. Матулечка. 12. Закаханне. 15. Краса. 16. Сонца. 19. Дождж. 21. Скарб. 22. Снег. 23. Пост. 24. Кіпа. 26. Ноч. 27. Воп.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.11 | 19.24 | 12.13 |
| Віцебск — | 7.01 | 19.14 | 12.13 |
| Магілёў — | 7.01 | 19.14 | 12.13 |
| Гомель — | 6.58 | 19.10 | 12.12 |
| Гродна — | 7.27 | 19.39 | 12.12 |
| Брэст — | 7.27 | 19.39 | 12.12 |

### Месяц

*Апошняя квадра 16 сакавіка. Месяц у сузор'і Вадаліва.*

### Імяніны

*Пр.* Марыі, Матроны, Васіля, Емяльяна, Капітона, Мікалая, Паўла, Яўгена, Яфрэма.
*К.* Аляксандры, Клаўдзіі, Святланы, Анатоля, Вінцэнта.




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 20 САКАВІКА

**У краіне**

**1897** год — нарадзіўся Мікалай Фёдаравіч Гікала, ваенны і партыйны дзеяч. З 1918-га — на ваеннай і партыйнай рабоце. У студзені 1932-га — студзені 1937-га — першы сакратар ЦК КП(б)Б. У 1938 годзе рэпрэсаваны. Рэабілітаваны пасмяротна.



**1927** год — нарадзіўся Хведар Дзмітрыевіч Жычка, беларускі паэт. Быў галоўным рэдактарам газеты «Літаратура і мастацтва». Аўтар паэтычных зборнікаў «Росныя лілеі», «Стой на вахце, сэрца» і іншых. Многія вершы паэта пакладзены на музыку беларускімі кампазітарамі.

**1930** год — нарадзіўся Барыс Міронавіч Шапіра, беларускі вучоны-эканаміст, доктар эканамічных навук, прафесар, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі. Аўтар навуковых прац па праблемах сельскагаспадарчай вытворчасці, рэфармавання аграпрамысловага комплекса Беларусі.

**1942** год — падчас Вялікай Айчыннай вайны партызаны пасля 12-гадзіннага бою вызвалілі раённы цэнтр Клічаў і ўключылі яго ў Клічаўскую партызанскую зону.

**1972** год — у Мінску адкрыта Генеральнае консульства Польшчы.

**У свеце**

**1800** год — італьянскі навуковец Алесандра Вольта ў лісце прэзідэнту Лонданскага каралеўскага таварыства паведаміў аб сваім вынаходстве батарэі электрычных элементаў (вольтаў слуп) — першай крыніцы пастаяннага току, якая адкрыла новую эру ў даследаванні электрычнасці.

**1880** год — нарадзіўся Рыгор Барысавіч Бархін, расійскі архітэктар, горадабудаўнік, педагог, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі. Адзін з заснавальнікаў Саюза савецкіх архітэктараў.



**1915** год — нарадзіўся Святаслаў Тэафілавіч Рыхтэр, расійскі піяніст, народны артыст СССР (1961), Герой Сацыялістычнай Працы (1975). Адзін з найбуйнейшых музыкантаў-выканаўцаў XX стагоддзя.

**1945** год — ажыццёўлены першы палёт «самалёта-снарада» 10-Х распрацоўкі калектыву канструктарскага бюро на чале з Уладзімірам Чаламеем.

## УСМІХНЕМСЯ

**Наведвальнік:**
**— А вось ведаеце, як было раней: хлеб у соль макнеш, часначком акраец натрэш... смаката!**
**Афіцыянт:**
**— Ну дык вы ўжо ўсё выбралі, якога года Шаблі падаць да вашага тузіна нармандскіх вустрыц?**

Інтэлект сучаснай моладзі ўжо напалову штучны.

**— Добры дзень, а ў вас ёсць кнігі па матывацыі?**
**— Так, вунь там на далёкай паліцы.**
**— А бліжэй няма?**

На сумоўі.
— Скажыце, якія лідарскія якасці ў вас ёсць?
— На любой гулянцы пасля тосту я заўсёды першы перакульваю чарку.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 950.

Нумар падпісаны ў 19.30 19 сакавіка 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12